**Змест.**

1. Уводзіны.
2. Асноўная частка.
   2.1 Карная аперацыя пад кодавай назвай "Франц".
   2.2 Трагедыя вёскі Асавок.
      2.2.1 Перадгісторыя.
      2.2.2 У той страшны студзеньскі дзень.
      2.2.3 Далейшы лёс Асаўка.
   2.3 Успаміны сведкаў.
      2.3.1 З успамінаў Дрывіцкай (Шпілеўскай) Ядзвігі Вацлаваўны.
      2.3.2 Успамінае Новік (Шпілеўская) Анэля Вацлаваўна, жыхарка вёскі Асавок.
      2.3.3 Успамінае Жывіца Вячаслаў Іўсіфавіч, былы жыхар вёскі Асавок.
      2.3.4 З успамінаў ветэрана арміі Уладзіміра Рачкоўскага.
      2.3.5 З успамінаў Гіліцкага Карла Антонавіча, жыхара вёскі Асавок. Копія пратакола дапроса
3. Мемарыяльны комплекс.
4. Заключэнне.

**Тэма даследчай працы:** “Трагедыя вёскі Асавок”
**Мэта:** Устанавіць дакладную карціну трагедыі, якая адбылася ў Асаўку ў студзені 1943 года.
**Задачы:**

• Вывучыць краязнаўчую літаратуру.
• Пабываць на месцы трагедыі.
• Прааналізаваць ўспаміны відавочцаў.
• Сабраць практычны матэрыял (Фотаздымкі, звесткі з літаратуры, інтэрнэт-рэсурсаў).

**Прадмет даследавання:**
Прадметам даследавання з'яўляецца трагедыя вёскі Асавок Асіповіцкага раёна.

**Практычная значнасць** працы складаецца ў пашырэнні ведаў па гісторыі роднага краю.

**Уводзіны.**

Слаўная беларуская зямля і яе людзі ўпісаны ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны асаблівым, залатым радком. Гэта край ўпартага супраціўлення Чырвонай Арміі нямецка-фашысцкім полчышчам, гераічнай барацьбы партызан і падпольшчыкаў. Гэта мірныя жыхары, якія зазналі на сабе звярыную сутнасць нацызму, гэта сотні знішчаных вёсак і пасёлкаў. Зусім непадалёк ад вёскі Каменічы, дзе мы жывём, знаходзіцца вёска Асавок, якую ў гады Вялікай Айчыннай вайны спасцігла тая ж доля, што і ўсім вядомую Хатынь. Мы шмат чулі аб гэтай страшнай трагедыі, былі не адзін раз на месцы гэтай трагедыі. Паўстала жаданне дакрануцца да гісторыі гэтага населенага

пункта, даведацца больш аб тым, што здарылася тады ў сорак трэцім.

Усяго за час акупацыйнага рэжыму на Асіповччыне было закатавана каля 4 тысяч мірных жыхароў, цалкам або часткова спалена каля 50 вёсак. За гэтымі лічбамі невыносны чалавечы боль, ад якога нельга пазбавіцца нават з гадамі, і гнеўная праўда і памяць пра ні ў чым непавінных людзей, якія заўчасна пайшлі з жыцця. Былі сярод іх малыя і старыя, маўклівыя і пахмурныя, вясёлыя і гаваркія. Словам розныя, але паміраць ніхто не хацеў.

Многае можа час. Ён здымае боль пакут і зацягвае раны. І толькі чалавечая памяць непадуладная гадам...

## Асноўная частка.

### 2.1 Карная аперацыя пад кодавай назвай “Франц”.

У гісторыі войнаў яшчэ не было такой канцэнтрацыі злачынстваў і варварства, такіх жахлівых злачынстваў, якія чынілі захопнікі на беларускай зямлі ў другую сусветную вайну. Яны вялі вайну перш за ўсё з мірным і бяззбройным насельніцтвам, з жанчынамі, дзецьмі і старымі. З уласцівай ім звярынай, садысцкай жорсткасцю гітлераўцы знішчалі савецкіх людзей, яны імкнуліся сцерці з твару зямлі ўсё жывое,

разбурыць, знішчыць тое, што стварыў наш народ на працягу стагоддзяў. Характэрнай асаблівасцю палітыкі “выпаленай зямлі” стала знішчэнне населеных пунктаў разам з жыхарамі. Тысячы вёсак змяталіся з твару зямлі, насельніцтва знішчалася, уганялася ў лагеры смерці і ў фашысцкае рабства ў Германію, маёмасць падвяргалася рабунку. У Беларусі з агульнай колькасці 9200 пасёлкаў і вёсак, разбураных і спаленых гітлераўцамі, звыш 5295 нацысцкія злачынцы знішчылі разам з усім ці часткай насельніцтва ў перыяд карных аперацый.

Масавае знішчэнне савецкіх людзей з ужываннем нечувана жахлівых і зверскіх форм знішчэння вялося пад выглядам барацьбы з партызанамі. Па задумах гітлераўцаў, знішчэнне населеных пунктаў разам з жыхарамі павінна было нанесці страх і жах на ўсёй часова акупаванай тэрыторыі. Яны разлічвалі з дапамогай падобнай тактыкі пазбавіць партызан іх рэзерваў, апорных пунктаў, харчовых баз, падтрымкі з боку насельніцтва і тым самым затармазіць арганізацыю і разгортванне ўсенароднай барацьбы.




Адной з такіх карных аперацый была аперацыя”Франц”, якая праводзілася ў студзені

1943 года супраць партызан і мясцовага насельніцтва некалькіх раёнаў Мінскай і Магілёўскай абласцей. Мэта аперацыі заключалася ў тым, каб хутка акружыць і раптоўным ударам знішчыць сілы праціўніка. План аперацыі прадугледжваў надзейную блакіроўку ўсяго раёна баявых дзеянняў. Перад часцямі і падраздзяленнямі была пастаўлена задача знішчыць партызанскія лагеры, бязлітасна знішчаць ворага. Была створана спецыяльная каманда, задачай якой была спальваць усе населеныя пункты ў раёне баявых дзеянняў. У агні апынуліся вескі Асавок, Брыцалавічы, Буда, Баранцы, Бортнае, Вялікая Гарожа, Вярбілава, Гоманаўка, Лука, Лучыцы, Макаўе, Малая Гарожа, Май, Мяжное, Ражышча. У вёсцы Брыцалавічы было знішчана 676 чалавек, у вёсцы Вялікая Гарожа і пасёлку Май — 270, у вёсцы Бортное — 98, Мяжное — 86, у Вярбілава — 45, у Буда — 42, Градзянка і Яноўка — 11, Асавок - 228 чалавек. 8 студзеня 1943 года ў вёсцы Макаўе Асіповіцкага раёна карнікі знішчылі 278 чалавек, у тым ліку 53 дзіцяці. Вёску спалілі.Усяго падвергнулася знішчэнню больш за 20 населеных пунктаў. Тымі сцюдзенымі днямі, па недакладных дадзеных, загінула каля 2 тысяч чалавек. А можа і значна больш…

14 студзеня аперацыя “Франц” завяршылася. 15 студзеня на імя камандуючага групы армій

“Цэнтр” падрыхтавана выніковае данясенне аб аперацыі: забіта 1143 “бандыты”, 882 чалавекі расстраляныя як “падазраваныя ў сувязях з бандамі”, разбурана 9 лагераў. Падчас прачэсвання мясцовасці было захоплена: 1000 чалавек у якасці рабочай сілы, 2000 галоў буйной рагатай жывёлы, 200 свіней, 120 авечак, 143 каня, 60 тон збожжа [8].

## 2.2 Трагедыя вёскі Асавок.

### 2.2.1 Перадгісторыя.

Асавок – назва ўтворана ад асноў “ось”, “аса”, якая з’яўляецца старабеларускім абазначэннем асіны [1].



Вёска размешчана ў 37 км на поўнач ад Асіповіч і ў 5 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка. З поўдня прымыкае лес. Праз вёску пралягае плаўна выгнутая вуліца, па абодвум бакам забудаваная драўлянымі дамамі.

У 1897 годзе вёска Асавок ўпамінаецца як засценак у Пагарэльскай воласці Ігуменскага ўезду Мінскай губерні з 54 жыхарамі і 7 дварамі. У 1931 годдзе тут быў створаны калгас “Трактар”. Асавок

або Трактар. Многія называлі гэтае паселішча так, бо існаваў калгас з такім жа найменнем. Да вайны тут у 53 дварах жыло каля трохсот чалавек. Гэта былі мірныя сялянскія сем’і – займаліся земляробствам, калупаліся ў агародах, трымалі небагата жывёлы. У вайну толькі аднойчы летам 1942 года заязджалі акупанты. Яны забралі некалькі кныроў, пару авечак і ўдаліліся. Тады з калгаснікаў ніхто не быў закрануты. Праўда, пазней, яшчэ пару разоў былі свіслацкія паліцаі, але яны наогул нічога не ўзялі, вельмі спяшаліся, штосьці гаварылі ў адносінах выбару старасты і хутка знікалі. Яны баяліся партызан і саміх сялян, якім проста не давяралі. З таго часу і жыла вёска ў чаканні лепшага…

У сярэдзіне снежня сорак другога года ў вёсцы размясціліся партызаны брыгады Каралёва. Было іх да трохсот чалавек. Былі накіраваны ў розныя бакі разведчыкі, у патрэбных месцах выстаўлены пасты і “сакрэты”. Наладжвалася сувязь з іншымі атрадамі. З харчаваннем было нармальна: напярэдадні ў баях з карнікамі былі захоплены немалыя трафеі. Наступаў новы, сорак трэці год. Далёка, на берагах Волгі ля сцен Сталінграда, ішла вялікая бітва. Партызаны рашылі ўнесці свой уклад у свяшчэнную барацьбу з ворагам. Так у ноч з 31 снежня на 1 студзеня народныя мсціўцы знішчылі цягнік з 345 фашысцкімі летчыкамі, якія накіроўваліся на

сталінградскі фронт у шостую армію Паўлюса. У гэтыя ж дні разведчыкі данеслі, што фашысты пачалі блакаду, падключаны франтавыя часці. Рухаюцца з боку Пухавіч, Чэрвеня, Беразіно, Свіслачы і Асіповіч. Спальваюць вёскі, расстрэльваюць мірных жыхароў. На шляхах наступаючага ворага сталі ў засаду групы партызан з атрада Каралева, Ціхамірава, Флягонтава. Нягледзячы на наяўнасць у гітлераўцаў танкаў, бронемашын і артылерыі, партызаны са сваіх засад наносілі ім адчувальныя ўдары, з-за чаго парыў фрыцаў некалькі астыў, але сілы былі няроўнымі.

### 2.2.2 У той страшны студзеньскі дзень.

5 студзеня атрад пакінуў Асавок. Разам з імі пайшла і частка жыхароў. Да моманту прарыву гітлераўцаў у Асаўку засталіся ў асноўным старыя, жанчыны і дзеці – прыкладна дзвесце пяцьдзесят чалавек. 6 студзеня гітлераўцы акружылі вёску, ўрываліся ў хаты і прыкладамі выганялі людзей на вуліцу, прымушаючы бегчы ў бок калгаснага гумна. Па ўсей вёсцы разносіліся лямант і стогны людзей. І чым больш гэты крык узмацняўся, тым больш звярэлі салдаты ў зяленых і чорных мундзірах. тых, хто паваліўся, яны таптали, прыстрэльвалі і давілі танкамі (іх чатыры ўварваліся ў вёску). Некаторыя спрабавалі ўцячы ў

лес, але іх усіх даставалі кулі… так і ляжалі гэтыя замерзшыя трупы пасярод белага поля [1].

Жыхароў вёскі натоўпам сагналі да гумна. Кулямётнымі і аўтаматнымі чэргамі усе прыгнаныя на калгасны пятачок сяляне былі расстраляны, а затым спалены. Іх хаты грабілі запланавана: кароў, коней,забітых свіней, авечак, птушку.

### 2.2.3 Далейшы лёс Асаўка.

Пачынаючы з 1944 года ў Асавок пачалі прыязджаць людзі з другіх населеных пунктаў, якія рашылі пасяліцца тут, так як дамы жыхароў вёскі не былі спалены і стаялі пустыя, куды можна было пераехаць сем'ям з дзяцьмі, якія засталіся без жылля. Вёска пачала ажываць. Пасля вайны вёска ўвайшла ў склад калгаса "Новы шлях". У вёсцы была малочнатаварная ферма, магазін, пачатковая школа. Нядаўна пабудавалі сучасны жывёлаводчы комплекс. Хочацца верыць, што вёска памаладзее, адродзіцца да новага жыцця.

## 2.3 Успаміны сведкаў.

Ад сведак той жудаснай трагедыі сёння засталіся толькі запісы ўспамінаў, зробленыя вучнямі нашай школы. Яны і спавядаюць пра тое, як гэта было.

**2.3.1 З успамінаў Дрывіцкай (Шпілеўскай) Ядзвігі Вацлаваўны**, жыхаркі вёскі Асавок.



“Мне ў тыя трагічныя дні споўнілася 16 гадоў. Зараз хутка 80, аднак я памятаю ўсе тыя падзеі, як сеняшні дзень. З нашай хаты, што стаяла сярод вёскі, фашысты выгналі на двор бацьку – Вацлава, маці – Антаніну і нас: мяне і Анэлю. Дзеда Мечыслава, якому было 82 гады і ен не мог хадзіць, адразу ж прыстрэлілі ля ганка хаты. Звярыная расправа напаткала і сям’ю Сухоцкіх, у якой прыгажуня-дачка Аня была замужам за грузінам і мела грудное дзіця. Яе разам з дзіцем закалолі штыком, а бацьку і маці застрэлілі ў хаце. Такі ж лёс напаткаў і сям’ю краўца Осіпава. У яго была жонка, дзве дачкі і сын.

Жыхароў вёскі сагналі ў адно месца. Потым загналі ўсіх ў хату. У гэтай хаце і пераначавалі. Ранкам выводзілі па аднаму маладых мужчын, вялі ў варыўню і расстрэльвалі. Каля сенцаў стаяў немец з кулямётам, а другі выводзіў. Потым расстрэльвалі старыкоў. Сястру маю Анэлю, Ядзю

Пракаповіч, Яню Манкевіч, Косцю Сухоцкую і мяне выбралі з гэтага натоўпу і паслалі ў дом каменданта. Там мы прасядзелі, пакуль у хляве не згарэлі жанчыны. Іх пасля мужчын заводзілі ў хлеў і расстрэльвалі. У каго былі дзеці на руках, то жанчын забівалі, а дзіцё астаўлялі жывым. Пасля гэтага аблілі хлеў бензінам і падпалілі. Нас заставілі гнаць кароў у вёску Малінаўка. Адтуль нам дапамагла ўцячы нейкая жанчына. Два дні мы блукалі па лесе, хаваліся ў закінутай мядзвежай бярлозе, а калі наступіла цішыня, выбраліся і накіраваліся ў вёску. Калі прыйшлі ў Асавок, убачылі жудасную карціну: з папялішча ішоў дым і дыміліся косці. У той дзень 8 студзеня немцы паехалі на Градзянку і ў лесе заўважылі ўцёкшых асаўчан. Яны акружылі людзей, прывялі ў Асавок, загналі ў хату і спалілі жывымі”.

### 2.3.2 Успамінае Новік (Шпілеўская) Анэля Вацлаваўна, жыхарка вёскі Асавок.



“Гэта было 6 студзеня 1943 года. Партызаны пакінулі веску, а немцы наступалі. У белых халатах яны ішлі з-пад вёскі Яноўка. Хто з жыхароў іх раней

заўважыў, той уцёк у лес. Акружылі вёску, сталі выганяць усіх людзей на вуліцу. Паставілі па два чалавекі ў дзве шарэнгі. Мужчын асобна, жанчын асобна. Было вельмі холадна. Жанчыны сталі прасіцца, тады іх загналі ў хату, закрылі стаўкі. Кругом хаты паставілі кулямёты. Сядзелі цэлыя суткі. Мужчын выводзілі па аднаму і расстрэльвалі. Потым расстралялі старых. Мяне, Ядзю Пракаповіч, Яню Манкевіч, Косцю Сухоцкую, маю старэйшую сястру Ядзю выбралі з гэтага дома і паслалі ў дом каменданта. Там мы прасядзелі яшчэ доўга. Пасля мужчын у гумно заводзілі жанчын і таксама расстрэльвалі. У каго былі дзеці на руках, то жанчыну забівалі, а дзіця пакідалі жывым. Потым гумно аблілі бензінам і падпалілі. Нас камендант адпусціў, калі згарэла гумно. Нам дазволілі апрануцца і прыказалі гнаць кароў у вёску Маліпаўка. Загналі кароў у Маліпаўку, там з сястрой Ядзяй начавалі ў нейкай жанчыны, якая ноччу нам сказала: “Дзяўчаткі, уцякайце!” і паказала, у які бок нам уцякаць. Так 9 студзеня па лесе мы вярталіся дамоў. Калі прыйшлі ў вёску, бачылі, як яшчэ дыміліся хата і гумно, у якіх палілі людзей.

Мы разумелі, што дзесьці тут, сярод абгарэлых трупаў, ёсць і нашы бацькі. У вёску пачалі збірацца тыя, хто застаўся ў жывых. Мы ўсе разам хавалі нашых родных і аднавяскоўцаў. Пазней я даведалася, што 8 студзеня немцы

распраўіліся і з астатнімі жыхарамі вёскі, якім удалося спачатку схавацца ў лесе. Іх акружылі, прывялі ў Асавок і спалілі жывымі”.

Сёстры Шпілеўскія Ядзвіга і Анэля пасля вайны жылі ў Асаўку, працавалі ў калгасе “Новы шлях”. Вышлі замуж нарадзілі і выхавалі дзяцей. Пахаваны на могілках у вёсцы Асавок.

Мы хочам прывесці ўрывак з сачынення Сідарчук Сашы “Памяць сэрца”. “Прайшло больш за 70 год, як адгрымела вайна. Але і цяпер яна страшным рэхам адгукаецца ў сэрцы кожнага жыхара Беларусі. Колькі гора яна прынесла нашай зямлі! Амаль у кожным населеным пункце ёсць помнікі, устаноўленыя ў знак памяці аб ахвярах Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць такі помнік і ў маёй вёсцы Асавок. Ён пабудаваны з мармуровых пліт, на якіх выгравіраваны прозвішчы людзей, якіх жывымі спалілі фашысты. Самаму старому чалавеку было 82 гады, самаму малому дзіцяці паўгода. Жывымі засталіся некалькі чалавек. Сярод іх: Дрывіцкая Ядзвіга Вацлаваўна, Новік Анеля Вацлаваўна, Жывіца Вячаслаў Іосіфавіч і Гіліцкі Карл. Зараз жыве толькі Жывіца Вячаслаў. Усё жыццё ён бярог у сваім сэрцы памяць пра сваіх родных і землякоў, якія 8 студзеня 1943 года

загінулі ад рук карнікаў. Гэты мужны чалавек, нягледзячы на страшныя выпрабаванні, змог пражыць доўгае жыццё. Бо жыў не толькі за сябе, а і за тых, хто загінуў. Напэўна, лёс зберог яго для таго, каб ён расказаў усім нашчадкам, што такое вайна.

Мы сустрэліся з ім у вёсцы Асавок, калі прыбіралі помнік да свята 9 Мая. Да нас падышоў зусім стары чалавек. Ён доўга назіраў за намі, а потым загаварыў. Было відаць, што чалавек вельмі хвалюецца, рукі яго нервова дрыжалі, на вачах былі слёзы.

### 2.3.3 Успамінае Жывіца Вячаслаў Іосіфавіч, былы жыхар вёскі Асавок.

"Калі пачалася вайна, мне было 10 гадоў. Бацька загінуў упершыя дні вайны і быў пахаваны на могілках вёскі Казімірова. У нашай сям'і было чацвёра дзяцей: Рэня, Зіна, Толя і я.

У той халодны студзеньскі дзень усіх жыхароў сагналі ў адно месца. Немцы спыталіся, хто пагоніць кароў у вёску Маліна́ўка. Згадзіліся чатыры хлопцы, сярод якіх быў і я. Я быў самы малодшы. Калі загналі кароў за вёску, то кінулі іх, а самі схаваліся ў лесе. Нацягалі яловых лапак і схаваліся пад вялікай ёлкай. Было вельмі холадна, быў вялікі мароз. Так і пераначавалі.

Раніцай пайшлі па лесе, куды ішлі – не ведалі самі. У лесе сустрэлі нейкіх людзей, магчыма гэта былі партызаны. Двое старэйшых хлопцаў пайшлі з імі. Далейшы іх лес мне невядомы. Нас засталося двое: я і вясковы хлопец Гіліцкі Кароль. Паблукаўшы яшчэ нейкі час, мы вырашылі вярнуцца ў вёску. Калі прыйшлі ў Асавок – убачылі жудасную карціну. На тым месцы, куды былі сагнаны людзі, усё дымілася, было кругом шмат крыві. Непадалеку я знайшоў рукаў ад сукенкі. Па гэтым рукаве я пазнаў сукенку маёй малодшай сястрычкі. Я зразумеў, згарэлі ўсе: мама, брат і дзве сястры.

Калі я зайшоў у сваю хату, (хаты немцы не спалілі) на стале ляжаў зарэзаны кабан. Ад гэтага відовішча мне стала страшна, таму я адразу ж выбег з хаты. У вёсцы было страшна заставацца, пагэтаму мы пакінулі яе і пайшлі ў суседні Казіміроў. Нанач нас прыюцілі нейкія людзі, накармілі, а раніцай сказалі: “Ідзіце, хлопчыкі”.

У Бярозаўцы жыў мой дзед. Даведаўшыся пра трагедыю ў Асаўку, ён прыехаў і забраў мяне. Да канца вайны я жыў ў дзеда, а пасля ў маёй цеткі. Было вельмі цяжка. Цётка засталася ўдавой, з малым дзіцём на руках, а яшчэ і мяне трэба было глядзець. Закончыў сем класаў, паступіў у Харкаўскае інжынерна-авіяцыйнае вучылішча, потым закончыў акадэмію імя Жукоўскага. Да выхаду на пенсію быў ваенным. У адстаўку

пайшоў у званні палкоўніка. Зараз жыву ў Мінску. Працягваю працаваь у Акадэміі навук інжынерам-метэаролагам.

Зараз у кнізе “Памяць. Асіповіцкі раён” я прачытаў імёны маіх родных:

Жывіца Кацярына Цярэнцьеўна, нарадзілася ў 1908, спалена жывой 08.01.1943, пахавана ў в.Асавок.

Жывіца Анатоль Юзафавіч, нарадзіўся ў 1938, спалены жывым 08.01.1943, пахаваны ў в.Асавок.

Жывіца Зінаіда, нарадзілася ў 1939, спалена жывой 08.01.1943, пахавана ў в.Асавок.

Жывіца Рэня, нарадзілася ў 1940, спалена жывой 08.01.1943, пахавана ў в. Асавок [4].

Засталася толькі памяць аб іх месцы, дзе яны пахаваны. Я кожны год прыязджаю на гэта месца. Я ўдзячны стваральнікам кнігі “Памяць”, што яны навечна захавалі імёны загінуўшых мірных жыхароў, і удзячны вучням Каменіцкай школы за тое, што яны вельмі жадалі, каб імёны загінуўшых мірных жыхароў вёскі Асавок былі высечаны на граніце”.

Вячаслаў Іосіфавіч падзякаваў нам за тое, што мы, школьнікі, даглядаем помнік, садзім каля яго кветкі.

Пасля гутаркі з гэтым чалавекам мы па-іншаму паглядзелі на вёску, яе апусцелыя вуліцы". На час напісання гэтай даследчай працы Жывіцы Вячаслава Іосіфавіча не стала. Памёр Вячаслаў Іосіфавіч у красавіку 2017г. Пахаваны ў горадзе Мінску.

**2.3.4 З успамінаў ветэрана арміі Уладзіміра Рачкоўскага**. Ён з болем успамінае сваіх родзічаў, якіх ў студзені 1943 года напаткаў жудасны лёс: 20 чалавек з прозвішчам Сухоцкі былі зажыва спалены фашыстамі ў вёсцы Асавок. Вось некаторыя вытрымкі: "Дзядзька маёй матулі быў жанаты на жанчыне з Асаўка. Уся радня жыла пад адным дахам. У той страшны дзень два браты з жонкамі завіхаліся ў двары: пілілі і складвалі дровы. Раптам з'явіліся немцы і загадалі ім рухаццца разам з астатнімі сяльчанамі ў назначанае месца. Бабуля з чатырма ўнукамі сядзелі ў хаце, грэючыся на печы. Адзін з немцаў, які першым зайшоў у хату, махнуў рукой: маўляў, сядзіце і не высоўвайцеся. І пайшоў да дзвярэй. Насустрач яму – яшчэ немец. Першы нешта яму патлумачыў, відаць, што няма тут нікога, і абодва пакінулі хату. Так бабуля з унукамі засталіся жывыя. Калі вестка, што згарэў Асавок прыйшла ў Рафалін, мой дзед па матулінай лініі запрог коней, папрасіў суседзяў зрабіць тое ж самае і паехаў разам з імі ў спаленую вёску па бабулю з дзецьмі.

Хутка наша сям’я папоўнілася новымі жыхарамі, але старэйшая дзяўчынка многа не пражыла. Перажыўшы моцны страх ад убачанага пажарышча і раптоўнай страты бацькоў, яна захварэла на лунацізм і памерла. На жаль даўно пайшла з жыцця і бабуля. Не стала і яшчэ дваіх выратаваных дзяцей. А вось чацвёртая, Марыя Баляславаўна Фралова (Сухоцкая), 1942 года нараджэння, жыве зараз у Маскве. Аб тых жудасных днях яна гаворыць з болем у сэрцы, як і кожны, хто перажыў вайну і не далічыўся родных і блізкіх” [6].

## 2.3.5 З успамінаў Гіліцкага Карла Антонавіча, жыхара вёскі Асавок. Копія пратакола дапроса.

203

им-5 Копия

ПРОТОКОЛ

допроса свидетеля.

д.Особок. 29 июня 1961 г.

-"-

Следователь следотдела КГБ при СМ БССР ст.лейтенант [redacted] допросил в качестве свидетеля:

ГИЛИЦКОГО Карла Антоновича, 1930 года рождения, уроженца и жителя дер.Особок, Осиповичского р-на, Могилевской обл., белоруса, гр-на СССР, члена КПСС с 1955 года, с начальным образованием, работающего трактористом колхоза "Новый путь".

Об ответственности за отказ или уклонение от дачи показаний и за дачу заведомо ложных показаний по ст.ст.178 и 177 УК БССР предупрежден. (ГИЛИЦКИЙ).

ВОПРОС: На каком языке желаете давать показания?

ОТВЕТ: Показания желаю давать на русском языке.

ВОПРОС: Где находились вы в период Отечественной войны?

ОТВЕТ: В период Отечественной войны я проживал на временно оккупированной немцами территории в д.Особок.

ВОПРОС: Чинились ли какие-либо злодеяния немецкими карателями в д.Особок за период немецкой оккупации?

ОТВЕТ: В первой половине января 1943 г. на рождество, немецкие каратели предприняли карательную операцию против партизан и мирных жителей, помогавших партизанам. Наша деревня Особок входила в партизанскую зону и перед этой карательной операцией в нашей деревне находился один из отрядов бригады КОРОЛЕВА.

Узнав о приближении карателей (откуда они двигались я не знаю) партизаны ушли из нашей деревни в лес и предупредили мирных жителей о приближении немецких карателей. После ухода партизан в лес многие мирные жители несмотря на мороз семьями также ушли в лес, а часть односельчан осталась в деревне. Я с родителями также ушли в лес, вернее выехали на лошади на санях.

Цэнтральны архіў КГБ Рэспублікі Беларусь

В лесу мы находились сутки, затем на вторые сутки, не помню от кого нам стало известно, что немецкие каратели "прочесывают" лес и уничтожают всех мирных жителей, обнаруженных в лесу, несмотря на возраст, к тому же, находясь в лесу мы видели как каратели подавали какие-то сигналы ракетами, слышалась беспорядочная стрельба. Люди в лесу замерзали, нечего было есть, поэтому мы решили возвратиться в деревню. Перед этим мы послали в деревню женщину ШКУРИНУ (имени её не знаю), чтобы она узнала, что творится в деревне, но она не возвратилась (впоследствии я узнал, что её тогда расстреляли каратели). На вторые сутки, после нашего ухода из деревни в лес, примерно часа в 3 дня, мы обозом поехали из леса в нашу деревню.

Как только мы выехали из леса и находились от деревни метрах в восьмистах, я увидел, что со стороны нашей деревни навстречу нам в направлении д.Гродянка едут на санях немецкие каратели, часть карателей шли пешком за обозом, находились ли каратели в деревне я не знаю.

Заметив нас, каратели немного проехали, а затем сняли с саней несколько пулеметов (ручных) выставили их на снегу в нашем направлении. Бежать было поздно и наш обоз продолжал следовать навстречу карателям. Когда мы поравнялись с карателями, то часть карателей поехала дальше в направлении д.Гродянка, а примерно I5 карателей остались и, зайдя к нам перед деревней в голову обоза, приказали всем сходить с саней и заходить в дом КОЗАЧЕНКА Алексея. Хорошо помню, что каратели были обмундированы в немецкую форму зеленого цвета, поверх которой у них были белые маскировочные холаты, но когда каратели начали загонять нас в дом, то холаты сняли, некоторые даже поснимали шинели, вооружены были каратели винтовками, автоматами, около дома они поставили несколько ручных пулеметов, у некоторых имелись пистолеты, но на знаки отличия я внимания не обратил.

Загоняя нас в дом каратели кричали на нас по-русски, между собой некоторые из них также разговаривали по-русски (разговаривал ли кто-либо из них по-украински или по-белорусски не обратил внимания), были среди карателей и немцы, так кроме русской

Центральный архив Республики Беларусь

речи со стороны карателей слышалась и немецкая речь.

Помню когда некоторые женщины с детьми просились, чтобы их отпустили домой, то каратели насильно загоняли их в дом, при этом всех кто сопротивлялся они сильно избивали палками, женщины и дети плакали. В дом КОЗАЧЕНКА Алексея было согнано тогда более ста человек, среди которых были в основном дети, женщины, старики. Меня также загнали с родными в этот дом, помню, что людьми был заполнен весь дом. Согнав нас в дом каратели закрыли ставни, а через некоторое время один из карателей, вооруженный пистолетом, зашел в дом. Как только он появился на пороге толпа мирных жителей отпрянула от порога и меня сильно прижали к стене, поднялся крик, плачь. Помню каратель, зашедший в дом, приказал по-русски: "Мужчины наперед", но женщины, плача, не пускали мужчин, тогда в дом зашло еще несколько карателей и начали насильно выводить из дома по одному, по два, а иногда и по три мужчины, выводили они их через некоторые промежутки времени и после их ухода со стороны сарая ЕВДАКИМОВИЧА (имени не помню) слышались беспорядочные выстрелы. Когда вывели несколько мужчин и стариков, то их жены и родственники, желая узнать, что происходит выбили в доме окна и ставни и пытались вылезть на улицу, но каратели их обстреляли из пулеметов (имелись ранения).

Через выбитое окно я затем видел, как мужчин, стариков и подростков, а затем женщин и детей каратели отводили из дома через улицу в сарай ЕВДАКИМОВИЧА, после чего оттуда доносились крики и беспорядочная стрельба. Как я уже показал в сарай выводили из дома по несколько человек, а в начале некоторых мужчин по одному.

Когда в доме оставалось несколько односельчан, я, поняв, что мирные жители в сарае расстреливаются, спрятался под кровать. Помню, что хозяин дома КОЗАЧЕНОК Алексей - старик спрятался под печь, а женщина КУДРЯВЦЕВА (имени её не помню) с грудным ребенком спряталась в сундук. Расстреляв почти всех мирных жителей, каратели начали в этом доме производить обыск и обнаружили под

Центральный архив КГБ Республики Беларусь

печкой КОЗАЧЕНКА, он не хотел вылазить и его начали избивать кочергой и по-русски кричали, чтобы он вылазил из-под печи, в результате он вылез. Помню также, что когда в сундуке заплакал ребенок КУДРЯВЦЕВОЙ и её с ребенком обнаружили в сундуке.

КОЗАЧЕНКА и КУДРЯВЦЕВУ с ребенком увели, слышались выстрелы со стороны сарая, затем в дом снова зашли каратели, в доме кроме меня и двух подростков под кроватью никого не было. Обнаружив нас под кроватью каратели, крикнули: "Вылазьте!", затем вывели нас на улицу. У одного из подростков - БАНДИК Федора - почему-то на одной ноге не было валенка, его один из карателей взял за ворот польто и потащил по снегу к сараю ЕВДАКИМОВИЧА. БАНДИК плакал, просился, чтобы его отпустили, но каратель его не пощадил, отвел в сарай и оттуда послышался один выстрел. Каратель возвратился. Не помню этот каратель или кто-либо из них сказал мне и подростку ШКУРИНУ Валентину (где он сейчас не знаю, в нашей местности он не проживает) по-русски, чтобы мы выгоняли из сараев коров и собирались их гнать куда прикажут.

Мы пообещали выгонять коров, но отойдя в сторону, незаметно убежали в лес.

Когда я находился недалеко от деревни в лесу (примерно метров 800), то видел, выйдя на опушку, как горел сарай ЕВДАКИМОВИЧА, со стороны которого доносились ужасные крики людей, поэтому я понял, что некоторые односельчане, очевидно, раненые, горели в сарае, я предполагал, что это были односельчане, выводившиеся в сарай из дома последними. Находясь тогда в лесу я видел в лесу труп нашей односельчанки старушки (мы её звали Евдокимиха). Позднее со слов уцелевших односельчан (кого не помню) я узнал, что незадолго до расстрела наших односельчан в сарае ЕВДАКИМОВИЧА, было также расстреляно в двух сараях ЛУКАШЕВИЧА Ивана еще более ста пятидесяти мирных граждан, отдельных граждан находили убитыми в других местах деревни, а некоторые погибли в лесу. Всего тогда во время этой карательной операции погибло около трехсот мирных жителей, в том числе и мой отец, мать, брат и три сестры.

Центральный архив КГБ Республики Беларусь

Помню, что эта карательная операция длилась примерно дней десять.

Куда убыли каратели из нашей деревни я не видел. Во время этой операции были учинены зверские злодеяния и над мирными жителями других деревень: Маковье, Гродянка нашего района и в ряде деревень Червенского р-на, но конкретные обстоятельства этих фактов мне не известны.

Примет карателей я не запомнил и опознать их не смогу. Какие конкретно немецкие подразделения участвовали в этой операции мне не известно.

ДОПолнений не имею, протокол мне прочитан, записано верно. (ГИЛИЦКИЙ).

ДОПРОСИЛ: СЛЕДОВАТЕЛЬ КГБ при СМ БССР
ст.л-т ( [redacted] )

Копия верна: СТ.СЛЕДОВАТЕЛЬ СЛЕДОТДЕЛА КГБ при СМ БССР
м а й о р [redacted] ( [redacted] )

<u>СПРАВКА:</u> Подлинник находится в архивно-следственном деле № [redacted] т. [redacted] по обвинению [redacted] и других, которое хранится в УАО КГБ ПРИ СМ БССР.
м а й о р – [redacted] ( [redacted] )

Центральный архив КГБ Республики Беларусь

**3. Мемарыяльны комплекс.**

Загінуўшыя былі захаронены ў брацкай магіле ў цэнтры вёскі. У 1974 годзе на магіле быў устаноўлены помнік.





10 сакавіка 2005 года на месцы іх знішчэння быў устаноўлены новы мемарыял з надпісам “8 студзеня 1943 года на гэтай зямлі было расстраляна і спалена 228 мірных жыхароў вёскі Асавок”. Нанесена 228 імен.



9 мая 2005 года адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяла, на якім прысутнічалі мясцовыя жыхары, вучні і настаўнікі Каменіцкай школы, раённы хор ветэранаў, а таксама сведкі тых жудасных падзей: Жывіца Вячаслаў Іўсіфавіч, Новік (Шпілеўская) Анэля Вацлаваўна, Дрывіцкая (Шпілеўская) Ядзвіга Вацлаваўна.

Захаваўся і ранейшы абеліск. Вяскоўцы, якія тут пражываюць, свята ўшаноўваюць памяць пра тых, хто калісьці тут жыў.

Прайшло семдзесят пяць гадоў з той пары, а памяць жыве. Да помніка заўсёды прыносяць жывыя кветкі, ён акуратна дагледжаны. На здымку удзельнік аўтапрабегу



“Дарогамі спаленых вёсак” Гіліцкі Мікалай, унук Гіліцкага Карла Антонаваіча, якому пашчаслівіла застацца жывым.

Цяпер, калі мы даведаліся аб жудаснай трагедыі не з кніг, а з вуснаў сведкаў тых дзён, мы іншымі вачыма паглядзелі на свет.

Здаецца, пасля гэтага аповеду, мы ўсе неяк пасталелі, памудрэлі. І, напэўна, упершыню па-сапраўднаму зразумелі сэнс страшнага слова вайна.

**Заключэнне:**

У выніку праведзенай працы мы даведаліся шмат аб трагедыі, якая адбылася ў студзені 1943 года ў вёсцы Асавок Асіповіцкага раёна. Для сябе мы адзначылі, што Асавок па праве можна назваць сястрой Хатыні. У далейшым мы працягнем збіраць матэрыял з мэтай пашырэння нашых ведаў аб іншых вёсках Асіповіцкага раёна, якіх напаткаў лёс Асаўка. Сваё даследаванне мы хочам скончыць радкамі наступнага верша Рачкоўскага Уладзіміра:

**Асавок, блакада – 43**

Вёска з цёплай назавй Асавок,
Партызаны тут ў лесе дзесьці.
Вёска – партызанскі астравок –
Адпачыць пагрэцца, штосьці з’есці.

Студзіць студзень холадам, зіма –
Маразы, завеі і сумёты.
Толькі партызанам сну няма,
Бо вакол блакада, кулямёты.
Спешна з цёплай вёскі адышлі,
Нават хлеб пакінулі ў печах.
Зараз жа навалай напаўзлі
Людаеды з роду чалавечых.
Дзвесце дваццаць восем чалавек –
Асавок увесь, хто быў у хатах,
Выгналі, заперлі ў хляве,
Падпалілі гітлераўцы-каты.
Дзвесце дваццаць восем. Тут усе –
І бацькі, і дзеці і старыя.
Смерць не выбірала па чарзе,
Чорны попел разам іх накрые.
Мірныя сяляне назаўжды
Засталіся тут, дзе зараз помнік.
Лес замшэлы побач праз гады
Тое пекла не забудзе, помніць.
Бачылі нябёсы і сам Бог
Нашы вёскі ў роспачы, у скрусе.
Дык чаму ж ніхто не дапамог
Шматпакутным вёскам Беларусі?
Шчыміць сэрца. Родны Асавок.
Дык ці ж ён такі адзіны?
Чорны, абгарэлы вугалёк
На далонях матухны-Радзімы.

**Літаратура:**

1. Жучкевич В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии/ В.А.Жучкевич. - Минск. БГУ,1974–438с.
2. Лукашэвич В. В лесах под Гродзянкой/ В.Лукашевіч. – Мінск. Изд. В. Хурсик, 2004 - 134
3. Пашкоў Г.П. Гарады і вёскі Беларусі / Рэдкал. Г. П. Пашкоў і інш.. — Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. — Т. 5, кн. 1. Магілёўская вобласць. — С. 84. — 728 с.
4. Памяць. Асіповіцкі раён. Мінск. БЕЛТА. 2002, - 718с.
5. Газета "Запаветы Леніна" №№ 120, 121, 1990г.
6. Газета "Асіповіцкі край" №3 ад 11 студзеня 2013г.
7. Газета "Асіповіцкі край" №31 ад 18 красавіка 2014г.
8. https://topwar.ru/104005-ustrashayuschie-deystviya-ot-keytelya-zabytaya-belorusskaya-tragediya.html
9. http://restinbelarus.by/wp-content/uploads/Протокол-допроса-свидетеля.pdf